Opłatę pocztową
uiszczono ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ СПРАВА

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня,
апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр.
Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.
Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош.,
сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр.
за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№. 16 Вільня, Субота, 12-га чэрвеня 1926 г. Год I.

Да нармальнае працы.

„Прыпарыла, нахмарыла і—ўдарыла...“— такімі славамі наш без пары памершы паэт характэрызуе надыход у прыпар навальніцы, якая так-жа хутка мінае, як і прыходзе.

Вось гэты абраз Алеся Гаруна дужа падобны да апошніх падзеяў у Польшчы. І тут у затхлай атмасфэры раскладу і маральнае гнілі нейкай віхурай мільганулі крывавыя дні на вуліцах Варшавы, было многа грукату і шуму, многа вострых і рашучых слоў, а ў выніку ўсяго—жыцьцё вярнулася ў сваю старую каляіну....

Так прынамся сталася на „вярхох“ сацыяльнае будоўлі Польшчы. Пануючыя клясы захавалі ў непарушным стане свае старыя пазіцыі. Апрача зьмены прэзыдэнта і ўраду—ўся адміністрацыя, блізу ўсе ваяводы, усе старосты і іншыя ўрадоўцы, у рукі якіх аддадзена жыцьцё, воля і дабрабыт „нізоў“ насяленьня, астаюцца на сваіх становішчах. І старыя падзел дзяржаўных цяжараў не зьмяніўся, і спосабы спагону падаткаў.... Усё—як і раней было....

Крыху інакш адбіліся маёвыя падзеі на „нізох“ сацыяльнае драбіны ў Польшчы. Сяляне і работнікі тут яшчэ мала сьвядомыя, слаба з'арганізаваныя. У іх яшчэ не пасьпела разьвіцца вера ў сябе—ў сваю ўласную сілу. Яны—паводле старое традыцыі—склонны былі ждаць для сябе вызваленьня ад магутнае волі і гэройскіх дзеяньняў адзінак, якія захацелі-бы ім дапамагчы....

Такія настроі панавалі і сярод беларускае масы. І затым-та ў першы мамэнт аружнага выступленьня п. Пілсудскага раптам прыпомніліся ўсе ягоныя старыя нязьдзейсьненыя абяцанкі і пасулы. Можа цяпер яны зьдзейсьняцца?!....

Ня зьдзейсьніліся і цяпер. Ня зьдзейсьніліся, бо і не маглі зьдзейсьніцца: так ужо наладжана жыцьцё народаў, што *даюць* толькі тым, хто *мае сілу сам узяць*, а ў слабых адбіраюць і тое, што яны маюць, ды ня могуць самі ўтрымаць....

Так сьсэзла „ачараваньне“ імем Пілсудскага ў усіх тых, хто йшчэ *хацеў* верыць у гэтае імя. Сьсэзла—і ўжо ня вернецца.

Затое мы вярнуліся да старых „нармальных“ у буржуазнай дзяржаве варункаў жыцьця, вярнуліся да тае сацыяльнае, палітычнае і нацыянальнае „раўнавагі“, на якой пабудавана сучасная Польшча. І ніводнае з нашых заданьняў—ці то сацыяльна-палітычных, ці культурна-нацыянальных, ці эканамічна-гаспадарчых ані не зьмянілася: наадварот, яны ўсе з яшчэ вялікшай сілай трэбуюць свайго зьдзейсьненьня, але ўжо не прыпадковымі „гэроямі“, а *самымі працоўнымі масамі*—сялянамі і работнікамі.

Дык і шляхі, на якіх можна зьдзейсьніць гэтыя нашыя заданьні і здаволіць нашыя патрэбы, астаюцца ўсё тыя-ж: гэта — перадусім *арганізацыя нашых сіл.*

Навучаныя і гістарычнымі прыкладамі, і ўласнай практыкай, і—ўрэшце — прост лягічным разважаньнем, больш сьвядомыя беларускія сялянскія і работніцкія элемэнты ўжо даўно ўзыйшлі на гэтыя шлях. А сваю арганізацыю яны абаперлі на ідэі *аб'яднаньня працоўных вёскі і места*, якія толькі йдучы разам могуць спадзявацца перамогі ў змаганьні за ідэалы і сялян, і работнікаў. — З гэтай мэтай у Заходняй Беларусі ўтварылася палітычная партыя—„*Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада*“, якая і зьяўляецца тым цэнтрам, дзе зыходзяцца абедзьве вялізарныя арміі працоўных.

Партыя гэтая—*легальная*, і кожны беларускі селянін, кожын работнік *мае права і павінен да яе належаць.* „Ідучы да сваіх мэтаў—гаворыцца ў праграме партыі— Беларуская Сялянска - Работніцкая Грамада карыстаецца шляхам легальным, законнай барацьбы на аснове канстытуцыі і права“.

На гэтым шляху партыя ў жыцьці Заходняе Беларусі мае перад сабою шырокія магчымасьці і іх будзе выкарыстываць у поўнай меры. Трэба толькі, каб працоўныя нашых мест і вёсак падалі сабе ўзаемна руку на грунце *супольнае арганізацыі*, трэба, каб ніводная вёска, ніводнае мястэчка не асталіся па-за межамі арганізацыі,—і сялянска-работніцкая партыя, магутная, як сам наш працоўны народ, *вывядзе беларускія масы на шлях перамогі.*

Новы урад.

Поўная адсутнасьць якой небудзь кіруючай думкі, напрамку і пляну ў спраўцаў „перавароту“ 12—14 траўня найляпей выявілася на складзе нарэшце зложанага новага ўраду. Запраўды-ж -нявартa было ня то, што ліць гэтулькі крыві, але навет—зьмяняць „дарэвалюцыйны“ ўрад — дзеля таго, каб набраць людзей зусім прыпадковых, нікому няведамых, а калі ведамых, дык сваей нядзарнасьцю, а навет — нефаховасьцю, якіх набраў у свой габінэт прэм. Бартэль, ці той, хто стаіць за ім.

Вось як выглядае пакуль што гэты „ўрад маральна“ рэвалюцыі“:

Прэм. Бартэль, можа, добры чалавек, а навет і чэсны інжэнер, здаецца, добры прафэсар-спэцыяліст. А толькі палітык—з учарайшага дня, ня маючы ніякага пляну ані праграмы дзяржаўнай працы.

Міністар унутр. спраў—той-жа п. Млодзяноўскі, што тапіў навет пэпээсаў на Палесьсі, лічучы навет іх „вывратоўцамі“. Чым ён горшы за п. Рачкевіча, гэта—тайна п. Бартэля!

Мін. загран. спраў — З. Залескі, галоўная спэцыяльнасьць якога — так-званая „заграністая прапаганда“, ці папросту—арганізаваньне друку ў заграічных газэтах (за грошы!) заметак і стацей, прыхільных да Польшчы. Як гэта называецца прасьцей, ня трэба казаць. Ясна адно, што ніякай новай творчай думкі новы кіраўнік у вонкавую палітыку Польшчы не ўнясе. Дый наагул замена Скшыньскага Залескім—ня варта навет паўшклянкі тэй „найдаражэйшай крыві“, аб якой так многа казалася нядаўна.

Ваенны міністар —марш. Пілсудскі. Як фаховец-міністар яшчэ не паказаў сябе нічым. Можа пакажа цяпер. Ясна толькі адно, што марш. Пілсудскі рашуча зьняў з сябе адказнасьць за агульны напрамак і працу ўраду, хаця, як фактычны спраўца „маральнага перавароту“, перадусім ня меў на гэта якраз—**маральнага права.**

Мін. скарбу—Клярнэр, аб якім „Robotnik“ кажа, што навет у параўнаньні з Чэховічам гэта — „зьмена на горшае“. П. Клярнэр, як сьцьвярджае „Robotnik“, „зьвязаны з буйным капіталам і яго палітыкай“, дык гэта—„ня суліць ніякага карыснага для працоўных звароту ў гаспадарча-фінансавай палітыцы Польшчы“.

Мін. справядлівасьці—Макоўскі, які быў ужо ў габінэце Сікорскага і добра даўся ў знакі беларусам і ўкраінцам.

Мін. асьветы — часовы — Мікулоўскі-Паморскі, — той самы „міністар рэлігіяў“, што разам з паліцыяй „паляваў на праваслаўных архіярэяў“, выкідаў аднаго за адным заграніцу ці садзіў у кляштторную турму. Спадзявацца ад яго, каб спыніў зьніштажэньне беларускай школы, няма падставаў.

Мін. зямляробства і зямельных рэформ — п. Рачыньскі, тварэц „закону аб парцэляцыі і асадніцтве“, які жорстка крыўдзіць беларускіх і ўкраінскіх сялян...

Найбольш характэрна для „перавароту“, на які ўскладалі столькі надзеяў паны пэпээсы, з лона якіх выйшаў сам Пілсудскі, гэта — тое, што абодва міністэрствы, зьвязаныя з справамі работніцкай клясы, заняты нейкімі няведамымі п. п. Юркевічам і Бронеўскім, а не пэпээсамі... Навет у габінэце Скшыньскага гэтыя партфэлі былі аддадзены П. П. С...

Мін. гандлю і прамыслов. — Квяткоўскі, аб якім „Rob.“ цьвердзіць, што гэта—эндэк...

Такі склад ураду ясна, што — ані зямлі, ані школы, ані—падаткавых палёгак ён нам ня дасьць.

Але можа яшчэ больш цікаўны і характарны тыя кандыдатуры, якія паважна высоўваліся ў часе перагавораў. Дык вось найцікаўнейшым з кандыдатаў быў—слаўны лідэр абшарнікаў у Сэнаце—п. Стэцкі, які—у часе разгляду зямельнага закону ў Сэнаце — выступаў галоўным аратарам кампаніі абшарнікаў проці закону дый шмат пагоршыў—на карысьць абшарнікаў — праведзены праз Сойм закон... Наагул трэба сабе добра ўцяміць запраўды ж дзіўную любоў хаця-б нашых крэсавых абшарнікаў да марш. Пілсудскага, каб адразу ацаніць усю „небясьпеку“ яго „рэвалюцыі“ для абшарнікаў...

Плакаць ці цешыцца?

Большасьць сялян да гэтае пары ўсё яшчэ добра ня ведае, што-ж такое зрабілася ў Варшаве? Праўда, усе бадай чулі, што быў там нейкі бунт, некая рэвалюцыя, што зрабіў яе Пілсудскі. Але-ж на гэтым ведамасьці сялян аб нядаўных падзеях і канчаюцца.

Запраўды-ж, мы на сабе вынікаў варшаўскіх падзеяў не адчуваем. Сэквэстратары прыяжджаюць і бяруць падаткі таксама, як і раней. Паліцыя паступае так, як і даўней,—дык многа сялян думае, што „нічога й ня сталася: вось, пачубіліся паны, дый годзе, а мужыку ўсё адно ярмо“...

Яно, калі-б прыглядзіцца толькі да вонкавага боку маёвых падзеяў у Варшаве, дык выглядаюць яны запраўды толькі, як вайсковы бунт адных генэралаў проці другіх. Хуткая згода паміж імі як-быццам пацьвярджае, што сялян, асабліва нас беларусаў, панская рэвалюцыя ня кранула.

Аб варшаўскіх падзеях ня можна аднак судзіць, толькі ўглядаючыся на вонкавы іх бок. Ня можна, бо тут мае вялікую вагу выклікаўшая іх прычына. Прычынай, канвой і варункам хуткай перамогі Пілсудскага было перадусім **банкруцтва палітыкі і гаспадаркі польскай буржуазіі.**

* * *

Галоўным палітычным лёзунгам польскай буржуазіі было і яшчэ ёсьць—утрымаць Польшчу ў радох вялікіх імпэрыялістычных дзяржаў, не адставаць ад „цывілізованых“ эксплёататараў Эўропы. Дзеля таго палякі гналіся за калёніямі і сваей дзяржаўнай граніцай парэзалі нашу Бацькаўшчыну Беларусь і Украіну, хутка забыўшыся аб ланцугох няволі, якімі самі йшчэ нядаўна званілі, і аб цяжкой кары, каторай гісторыя памсьцілася на іх крыўдзіцелях за векавое ярмо.

Палітычная мэта імпэрыялістычнай „вялікадзяржаўнасьці“ вымагае адпаведна збудованай сыстэмы гаспадарчага вызыску. Імпэрыялістычныя гаспадарствы гатовы прыняць да свае кампаніі на роўных правох толькі такую дзяржаву, якая патрапіць меці такі самы, як у іх, кулак. Свой мілітарны кулак эўрапэйскія і амэрыканскія каршуны капіталу будавалі сотнямі гадоў на вызыску крыві і нядолі сялян і работнікаў—ня толькі сваіх вялізарных краін, але і дзесяткаў і сотняў міліёнаў народу падняволяных калёніяў.

Польская буржуазія ня мела шмат часу гэтакіх калёніяў, дый ня мае яна і цяпер добрых гаспадароў, каторыя-б ведалі, што, каб авечку стрыгчы, ня можна яе абдзіраць са скуры, бо здохне... Вось ўсё гэтае і давяло да таго, што польская буржуазія страшэнна прыціснула гаспадарча і эканамічна працоўных людзей, што — у выніку гэтага—зруйнованае бяззямельнае сялянства ня можа купляць жадных тавараў, а дзеля таго зачыняюцца фабрыкі, разваліваецца прамысловасьць, а да 3 міліёнаў безработнага, беззямельнага і малазямельнага сялянства прыбывае 400.000 безработных сямей мястовага пралетарыяту. Праўда, лепш зарганізаваным работнікам, страціўшым працу, выплачываюць нейкія жабрацкія дапамогі. Але большасьць рабочых гэтых дапамог не атрым-

лівае, а і тыя, што атрымоўваюць, ня могуць імі здаволіцца і трэбуюць працы і хлеба, — таксама, як сяляне зямлі бяз выкупу і сплат. Буржуазія зямлі даць ня хоча, працы даць ня ўмее. Дык супакоівае і сялян і работнікаў—фізычнай сілай. Найбольш неспакойную часьціну былых жаўнераў сьпіхае яна пад відам ваенных асаднікаў на беларускія і ўкранскія землі. Але-ж вядзеньне такое палітыкі, на вялізарную армію жаўнераў, афіцэрства, яўнай і тайнай паліцыі, ды ўрадоўцаў, на ўтрыманьне вастрогаў і ў іх — тысячаў палітычных вязьняў, дый на асадніцтва і дапамогі безработным патрэбны грошы, знача й новыя падаткі. Новыя-ж падаткі далей руйнуюць сялянства, дык яшчэ больш зачыняюць фабрыкі і ўсё новыя тысячы работнікаў выкідаюцца на вуліцу, яшчэ ямчэй чуваць крыкі: „хлеба, працы, дапамогі!“.

Вось тое зачараванае кола, у якое завяла Польшчу гаспадарка буржуазіі, каторай манія вялікадзяржаўнасьці засланіла вочы на сумную жыцьцёвую праўду...

Але навет усьведамленьне ўсяго вышэйсказанага не зрабіла сярод буржуазіі Польшчы гэтакай панікі, як зьмяншэньне пэнсіяў галоўнай апоры дзяржавы — урадоўцам яе. Калі-ж прыняць пад увагу што-месячны ўзрост дарагоўлі, дык выходзе, што пэнсіі гэныя да таго й самі сабой стала зьмяншаюцца што-месяц. Хоць паны і выставілі на міжнародавую ліцытацыю багацьці Польшчы, некаторыя з іх перазалажылі (тытун, сернікі), але-ж атрыманых грашэй усё не хватае. Мусілі зьмяншаць ня толькі пэнсіі, але-ж і лічбу ўрадоўцаў; дый ня толькі ўрадоўцаў, але і афіцэраў, жаўнераў і паліцыі наагул, сталі такі паважна гаварыць аб зьмяншэньні арміі і паліцыі. Але гэта ўжо рэальная пагроза польскай „вялікадзяржаўнасьці. Англія, каторай патрэбны моцны польскі кулак дзеля пагрозы Радавым Рэспублікам, „перасьцерагла“ польскую буржуазію, што ня будзе лічыць яе сабе роўнай...

Вось у варунках гэткага банкруцтва буржуазнай гаспадаркі, у атмасфэры аканчальнага правалу шляхоцка-мяшчанскіх лятуценьняў аб высокадзяржаўнасьці, мусіла дасьпець думка аб нейкай перамене. І дасьпела. Ня было ў Польшчы такой клясы, каторая ня імкнулася-бы да нечага „новага“. Кожная кляса хацела і хоча іншае будучыны, лепшае толькі для яе,—але-ж усе хочуць **новай**.

(Канец будзе).

Пасьля агульнай забастоўкі у Англіі.

Агульная забастоўка ў Англіі скончана. Не працуюць яшчэ пакуль што вуглякопы, аднак шансы іх на перамогу, ясна, далёка цяпер меншыя. Капіталістам страшна была толькі солідарнасьць усіх работнікаў; маючы справу з аднымі вуглякопамі, яны адразу паадважнелі і дамагаюцца зьмяншэньня заработных плат на 10 працэнтаў ды далейшых зьніжак у найбліжэйшай будучыні.

Прычына няўдачы забастоўкі—здрада правадыроў ангельскіх прафэсіянальных саюзаў (гэтакіх самых, як у нас П. П. С). Кожнаму ведама, як цяжка работніку прыступіць да забастоўкі. Капіталісты абрэзываюць заработную плату, жыць можна, толькі выбіваючыся з сіл ды напалавіну галадаючы, але з другога боку ўчасьце ў забастоўцы, хаця-бы навет фабрыканты ў канцы змушаны былі ўступіць,—зразу адбіраець работніцкай сям'і ўсё, бо-ж ніхто не зарабляе, а запасаў няма.

Выбар тутка ня лёгкі, аднак ангельскія работнікі ведалі ўжо з практыкі, што перамога капіталу ў адным мейсцы азначаець прарыў на ўсей лініі. Дружна падтрымалі яны вуглякопаў і гатовы былі змагацца супольна з імі да канца. Пачалі хадзіць чуткі, што ў забастоўку будзе ўключана так-званая **другая лінія**—гэта значыць: акрамя вуглякопаў і прылучыўшыхся да іх работнікаў транспорту ды мэханікаў, мелі кінуць працу ўсе другія работнікі (почта, тэлеграф, вада, прыватныя прадпрыемствы).

Вось-жа гэтага та і спужаліся сацыял-здрадніцкія правадыры. Забастоўка ўсіх без выключэньня работнікаў пры адкрытым падтрыманьні капіталістаў урадам мусіла-б завастрыць барацьбу да апошніх граніцы. У Англіі магла ўзьняцца рэвалюцыя.

Але-ж усюды для сацыял-здраднікаў буржуазны парадак даражэй, як інтарэсы работнікаў; іх палохае рэвалюцыя. Дык яны і пачалі круціць. Буржуазныя сынкі і падкупленыя падонкі работніцкай клясы арганізавалі ўдар забастоўцы. Замест прызваць работнікаў да барацьбы з штрайкбрэхерамі, сацыял-здраднікі радзілі работнікам „карыстаць з вольных дзён“, „аддыхаць сьвежым вясеньнім паветрам“, „гуляць у футболь“ і г. далей. Такія рады—ў часе, калі капіталісты зьбіралі цэлую армію для зламаньня забастоўкі, маглі даваць толькі „сацыялісты“ тыпу П. П. С. Нарэшце, бачучы, як палажэньне завострываецца з кожным днём, управа, кіруючая забастоўкай і апанаваная імі—спыніла агульную забастоўку.

Гэта тое самае, як бы ў часе наступленьня на ваенным фроньце афіцэры скамандавалі вылезшым з акопу салдатам вяртацце назад! Шмат работнікаў не паслухала здраднікаў, іншыя ня ведалі, што робіць, рэшта паслухала. У гэтым замяшаньні агульная забастоўка разьбілася, асталіся адны вуглякопы, каторыя пробуюць змагацца далей самі.

У сваей адозьве да работнікаў усіх краёў ангельскія вуглякопы гаворадь: „мы ведаем, што змагаемася ў абароне інтарэсаў і правоў усіх работнікаў. Паміма спыненьня агульнай забастоўкі **правым** крылом прафэсіянальных саюзаў, мы лічым, што не апынімся адны: нас падтрымаюць работнікі іншых краёў. Просім работнікаў усяго сьвету, каб і далей не дапускалі транспорту вугальля ў Англію, просім таксама матэр'яльнае помачы. Кожны грош, які вы зьбярэце для нас,—будзе вялікай дапамогай у барацьбе за адваяваньне людзкіх варункаў жыцьця“.

Як бы ня склаліся абставіны,—цяжка лічыць сягодня на перамогу ангельскіх вуглякопаў. Надта ўжо няроўная барацьба. Пакуль работніцкі рух ня будзе ачышчаны ад сацыял-здрадніцкіх элемэнтаў, яшчэ не адзін раз работнікі праіграюць. Ангельская забастоўка—жывы доказ гэтага.

К.

У Польшчы.

Сялянскія рухі.

Як падае „Роботнік“ (№ 157), у Влошоўскім павеце знаходзіцца маса войска і паліцыі. Прызвалі іх абшарнікі, заяўляючы, што сяляне пасуць на іх пожнях скаціну, навет нападаюць на дворы.

Вёска Вэнгжыново была абстаўлена кулямётамі, і арыштавалі ў ёй 15 асоб. Паліцыя па дарозе да пастарунку біла арыштаваных.

У Баранавіцкім павеце 13 конных паліцыянтаў пад камандай упраўляючага маёнткам А. Ставінскага напала на вёскі Войніцы і Цыганка. Шэсьць сялян цяжка ранены і знаходзяцца ў бальніцы.

Забастоўка ў фабрыцы „Perkun“.

У фабрыцы матораў „Perkun“ (Варшава) забаставалі 8 г. м. ўсе работнікі лікам 400. Прычына забастоўкі—нявыплачываньне ўправай фабрыкі заработнай платы ад некалькіх ужо месяцаў.

Галадоўка палітычных вязьняў у Беластоцкім вастрозе.

Пасьля галадоўкі ў Вільні і Наваградку выбухла новая—у Беластоку.

350 палітычных вязьняў, чакаючых ўжо па 14 месяцаў на суд, дамагаюцца спыненьня зьдзекаў з боку адміністрацыі. На месца высланы спэцыяльны дэлегат міністэрства справядлівасьці.

Хаця пасьля перавароту што-раз то галасьней з усіх канцоў дзяржавы чуваць крык: „звольніце палітычных вязьняў“! — урад глухі на яго. Так-званыя польскія сацыялісты, пішучы аб галадоўцы ў Беластоку, выражаюць толькі сваё нездаваленьне з прычыны таго, што задоўга прыходзіцца арыштаваным чакаць на суды...

Чуткі аб—„Дзяржаўнай Радзе“.

Газэты пішуць, быццам у Польшчы, замест Сойму і Сэнату, будзе створана нейкая „Дзяржаўная Рада“—з 30 асоб з розных партыяў, якія будуць папросту назначаны... прэзыдэнтам. Гэтая Рада будзе мець „дарадчы голас“ дый права кантролю працы ўраду... Праект высунуты быццам кракаўскімі кансэрватарамі, якія, здаецца, маюць іграць значную ролю ў дзяржаўнай працы новых кіраўнікоў Польшчы...

Якім хацела-бы відзець „Rzeczpospolita“ будучы Сойм?

„Каб Сойм мог выпаўніць свае задачы, трэба рашуча ўвясьці навуковы цэнз і цэнз веку“. Гэта значыць, што па іхняму ў Сойм можна было-б выбіраць толькі буржуяў і абшарнікаў, бо хоць у галаве іх пуста, але ўсе яны пакончылі навукі.

„Каб Сойм перастаў быць месцам інстытуцый, вызываючых абураньня ў народзе, ды кампрамітуючых яго самага трэба“... можа думаеце не выбіраць панкоў, ды фаховых ашуканцаў, каторыя якраз найбольш аскандаліліся?—не і не!... „трэба скончыць з пасольскай нятыкальнасьцю“, — або іначай: заткнуць горла паслом ад сялян і работнікаў, каторыя ў Польшчы найбольш карысталіся свабодай выступленьняў...

Апэтыты нішто, можна сказаць!

Ці разлом і ў П. П. С.?

Карфантаўская „Рэчпаспаліта“ паведамляе, што ў лоне „адзінай і непадзельнай“ П. П. С. зрабіўся раскол.—Некалькі паслоў быццам выйшлі з партыі, ці выключаны з яе—за „прыхільнасьць да палітыкі Пілсудскага“. „Роботнік“ страшэнна лаецца на газэту за гэтую „брахню“... Можа П. П. С. чаго яшчэ і спадзяецца ад „палітыкі Пілсудскага“, але—хутка прыдзецца ўсё роўна рваць або з Пілсудскім, або—навет з тэй „спакойнай“ часткай пралетарыяту, на якой пэпэсы, паводле трафнага выражэньня Пілсудскага (ходзіць такая чутка...)—„жыруюць, як вошы“. У кожным разе — „жыраваць“ адначасна на „імені Пілсудскага“ ды на пралетарыяце ўжо ня можна..—Трэба было-б выбраць адно з двух.

Як змагаліся з безрабоцьцем.

„Sprawiedliwość“ (№ 21) падводзіць ітогі барацьбы папярэдніх урадаў з безрабоцьцем.

Наагул, безрабоцьце за той час ня зьменшылася, а, наадварот, збольшылася. „Успакаівалі“ безработных, як ведама, больш аружжам і арыштамі, як дапамогай.

Так за час ад 21/XI—25 г. да 17/IV—26 г. была пушчана на таўпу 65 разоў конная паліцыя і 65 разоў у таўпу стралялі. Цяжка і лёгка раненых—250 асоб, забітых 13, арыштаваных каля 1100.

Пэнсія п. Войцеховскаму.

Чытаем у „Niezależnym Chłopie“ (№ 26), што быўшаму прэзыдэнту Рэспублікі—Войцехоўскаму прызнана аж да сьмерці пэнсія. Плаціць яму будуць месячна, як чыноўніку першай клясы.

Заграніцай.

Чарговая сэсія Рады Лігі Народаў і пагроза развалу Лігі.

7 чэрвеня пачаліся паседжаньні чарговай сэсіі Рады Лігі Народаў. Сэсія мае апрацаваць усе праекты, якія мае аканчальна зацьвярдзіць верасьнёвая сэсія Агульнага Збору Лігі. На першым мейсцы сярод гэтых праектаў стаіць справа прыняцьця Нямеччыны ў склад Лігі дый справа пашырэньня Рады Лігі. Апошняя справа амаль не разваліла Лігу ўжо на сакавіковай сэсіі Агульнага Збору. Дый цяпер, як ні круцілі Чэмбэрлены і Брыяны, але здаецца — ня ўдасцца ім папярэдзіць выхад з Лігі Бразыліі, а мо' навет і Гішпаніі. Бразылія ўжо заявіла, што выйдзе, калі ня будзе дадзена ей сталае мейсца ў Радзе.

Паміж іншым, на сэсіі Рады прадстаўнік Англіі з трыумфам заявіў аб — поўным паразуменьні між Англіяй і Турцыяй у справе Мосулю, якая столькі часу пагражала вайной на Блізкім Усходзе.

Румынія зброіцца.

Румынія атрымала пазыку ад Англіі — 200 мільёнаў ліраў на падводныя лодкі.

Трэба-ж зразумець, што Румынія — толькі адзін „адрэзак“ у тым „усходнім фроньце“, якім наагул так цікавіцца Англія. З гэтага трэба заключыць, што не забыта і бліжэйшая суседка ды саюзьніца Румыніі на гэтым-жа „фроньце“...

Дык можа гэтым „супольным фронтам“ тлумачыцца шмат што з апошніх падзеяў у Польшчы?!...

Новы літоўскі прэзыдэнт аб праграме ўраду.

Як падае „Słowo“ (№ 133), у прамове да прадстаўнікоў прэсы новы прэзыдэнт Літвы д-р Грыніўс ня толькі крытыкуе працу папярэдняга ўраду, але кажа аб патрэбе замены шмат якіх літоўскіх законаў новымі. Перадусім лічыць прэзыдэнт неабходным скасаваньне ваеннага стану. Адносна да амністыі ён кажа гэтак: „нашыя вастрогі перапоўнены. Сядзяць у іх салдаты і афіцэры за розныя службовыя правіннасьці. Кара большая, чым віна. Грамадзянства нічога ня страціць, калі дасьць ім свабоду. Тое самае і з палітычнымі. Маем іх некалькі катэгорый: працуючых на карысьць суседніх дзяржаў, камуністаў і фашыстаў. Гэтыя апошнія далі пазнаць сябе ў часе выбараў, раскідываючы пракламацыі з заклікамі да перавароту. Усе яны павінны быць выпушчаны, апрача тых, што сідзяць ужо другі раз“. „Патрэбна рэарганізацыя палітычнай паліцыі, бо Літва была дагэтуль паліцэйскай дзяржавай, — а такжа новая, справядлівейшая палітыка да нац. меншасьцяў“.

Ваенны стан на граніцы з Польшчай ня будзе зьняты.

Новы прэзыдэнт вялікую вагу кладзець на прыязныя зносіны з СССР.

Праграма, значыцца, буржуазна — ўмяркаваная; паглядзім, як будзе яшчэ правадзіцца.

Новы скандал з Гіндэнбургам у Нямеччыне.

У Нямеччыне новую сэнсацыю зрабіла апублікаваньне пісьма прэз. Гіндэнбурга да старшыні міжпартыйнай камісіі ў справе плебісцыту (ўсенароднага галасаваньня), ці трэба плаціць былым нямецкім каралям ды князям за сканфіскаваныя рэвалюцыяй іх маёнткі?

Гіндэнбург рашуча націскае на старшыню, даводзячы, што несправядліва адбіраць уласнасьці князёў без адшкадаваньня, бо гэта было-б — агіднай „няўдзячнасьцю“ адносна да слаўных нямецкіх „валадароў“...

Апублікаваньне лісту выклікала страшэннае абурэньне сярод нямецкай дэмакратыі, а перадусім сярод сацыял-дэмакратаў. У адказ на гэта Гіндэнбург праз сваю канцэлярыю заявіў, што ліст гэты запраўды пісаны ім, дый што ён вельмі здаволены фактам яго апублікаваньня і не адмаўляецца ад ніводнага напісанага ў ім слова...

Спадзяюцца вострых сутычак дзеля гэтага ў парляманьце.

Зьезд „чырвоных франтавікоў“ у Бэрліне.

У Бэрліне на Сёмуху адбыўся зьезд „чырвоных франтавікоў“ з усей Нямеччыны. Паміма перашкод (дзяржаўныя чыгункі да апошняга дня ўтрудвялі дарогу), як пішуць газэты, быў магутны. Прыймалі ў ім учасьце да 300 тысяч людзей.

Нямецкія фашысты дамагаліся забароны зьезду, даказываючы, што „чырвоныя франтавікі“ могуць выклікаць рэвалюцыю. У часе паходу правакавалі чны праліцьцё крыві і толькі дзякуючы запраўды жалезнай арганізацыі і дысыпліне „фран-

тавікоў", дыстыпліне, на якую здольна толькі работніцкая кляса,—ахвяр ня было.

Цікавае апісаньне паходу аднэй з буржуазных бэрлінскіх газэт:

„Хто бачыў чырвоную дэманстрацыю, пішa яна,—той мусіць лічыцца з камуністамі. Тыя, што прыехалі з усіх бакоў Нямеччыны,—гэта ня былі разбойнікі — гэта былі нямецкія хлопцы, якіх мы бачылі ў салдацкіх мундзірах; гэта былі работнікі—камуністы, якія ведаюць, чаго хочуць".

Француска-гішпанская канфэрэнцыя ў справе Марокко.

У Парыжу мае адбыцца канфэрэнцыя абедзьвюх пераможніц у марокскай вайне — Францыі і Гішпаніі, на якой мае быць вырашана справа падзелу „ваеннае здабычы" ці—зваяваных жывых народаў Марокка і іх зямлі.

Насьпявае—між Японіяй і Амэрыкай...

Амэрыканскія газэты страшэнна абураны апублікаванымі ў іх быццам тайнамі плянамі Японіі — захапіць гвалтам Філіпінскія астравы (якія, дарэчы напомніць, — таксама захоплены аружна Амэрыкай ад Гішпаніі). Так пакрысе ды паволі—падрыхтоўваецца як насяленьне Амэрыкі, таксама і сусьветная апінія—да нямінучай вайны між Амэрыкай і Японіяй.

ХРОНІКА.

Суд над беларусамі. 22./VI. с. г. у Віленскім Акружным Судзе будзе разглядацца справа жыхара м. Пастаў Дзеравянкі Аляксандра і жыхара вёскі Целякі Аляксандра Целяка, абвінавачаных — першы з арт. 126 ч. I К. К. — другі з арт. 129 ч. I, III і IV Кар. Код.

Бараніць будзе вядомы адвакат Родзевіч.

Выкіданьне незаможных вучняў. Як даносіць „Robotnik" (№ 157), у Лунінцы выкідаюць з урадавае гімназіі 200 вучняў, пераважна беларусаў, з прычыны неўнясеньня належнай аплаты за навуку.

Сярод насяленьня пануе вялікае абурэньне. Цяжка мужыцкаму сыну вучыцца!

Водгукі першага мая ў Вільні. У польскай мясцовай прэсе вядзецца спрэчка аб адкрытым пісьме ўласьніка складу пэрфумаў—В. Вубэ. Вубэ абураецца на студэнтаў за напад на работніцкі паход. Сцьвярджае, што акадэмікі былі п'яныя, і што гэта не дастойна грамадзяніна-паляка. Далей ён выражае зьдзіўленьне з прычыны таго, што студэнцкая моладзь не запратэставала проці хуліганства калег фашыстаў, паведамляе, што ня будзе больш даваць ахвяр на акадэмічныя меры.

Забастоўка шаўцоў у Вільні трывае. Прыймае ў ей участце каля 900 асоб. 9/VI мелі мейсца бойкі. Ходзяць чуткі, што мае быць абвешчана клясовымі союзамі агульная забастоўка.

Скандальныя экзэкуцыі. Як мы ўжо падавалі, у апошнія дні ў Вільні здарыўся цэлы рад дзікіх скандалаў пры забіраньні маемасьці дробных гандляроў за падаткі. Скандалы выклікаены былі сэквэстратарамі, якія, прыкладам, на Дравяным рынку пачалі забіраць жывую рыбу ў мяхох, хаця гэта было раўназначна з зьнішчэньнем тавару, які ў такую гарачыню мусіў-бы згніць бескарысна. Тое-ж было ў Галях, дзе забіралі масла і сыры—так сама на глум. У абодвух выпадках справа скончылася баталіяй, пры чым пацярпелі абедзьве староны.

Але надовачы здарыўся скандал, які ня меў падобных. Аднаму купцу, які не аплаціў значнае сумы падатку, нядоімка была раскладзена на раты—па 300 зл. у тыдзень. Калі сэквэстратар прыйшоў за чарговай ратай, купец даў яму гэныя 300 зл. і атрымаў квіт. Пасьля напісаньня квіта сэквэстратар зусім неўспадзеўкі загадаў прыведзеным людзям забіраць мяшкі з цукрам — на пакрыцьце нядоімкі! Муж пабег у скарбовую палату, а жонка пачала бараніць сваё дабро, якое бралі сілай. Пачалася тузаніна і крыкі: ратуйце! рабуюць! Народ пачаў зьбягацца на гэныя крыкі. Сабралася вялізарная таўпа — нешта каля 1.000 душ.—Скончылася усё тым, што урэшце скарбовы ўрад загадаў прыпыніць дзікую сцэну.

Віленскія купцы страшэнна ўзбураны ўсімі гэтымі фактамі. Яны пастанавілі больш не звярачацца да мяйсцовае ўлады, якая дапускае падобныя выпадкі, а да старшыні ўраду, міністра скарбу і соймавых паслоў з пратэстам і жалабай на паступаньне віленскае скарбовае палаты.

З выдавецкае нівы. За апошнія часы беларуская выдавецкая праца ў Заходняй Беларусі разьвіваецца вельмі слаба, апрача аднае толькі прэсы, якая ў Вільні складаецца з трох беларускіх часопісяў і аднае польскае дэфэнзыўнае ў беларускай мове („Белар. Слова"). Выход новае беларускае кніжкі—рэдкае зьявішча. У сувязі з гэтым прыходзіцца адзначыць факт, што пачынаюць друкаваць кніжкі ў беларускай мове людзі і арганізацыі, далёкія ад беларусаў і беларускага руху. Гэтак у Лодзі Выдавецкае Т-ва „Компас" выпусьціла пабеларуску **„Эвангельле паводле Лукі"**— ў перакладзе, зробленым з грэцкае мовы. Эвангельле высылаецца Т-вам дарма—за зваротам коштаў перасылкі—ўсім, хто зьвернецца да Т-ва.

Дарэмныя патугі. Нездаволены пратэстам беларускіх матурыстаў проці брудных выступленьняў „доктара" Павлюкевіча проці грам. А. Луцкевіча,—„дохтар" пробаваў вырваць у некаторых з іх заявы, быццам яны падпісалі свой пратэст „несьвядома". Аднак, моладзь з абурэньнем адкінула гэтыя прапазыцыі.

Афіцыяльны курс грошы на 10 чэрвеня. Даляр —10 зл. — гр. Залаты рубель — 5 зл. 25 грошы.

10. VI. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 10,25.

З жыцьця Горадні.

× **З вастрогу ў Горадні.** Калі ўвойдзеш у муры вастрогу, то ўраз-жа бачыш вокны з кратамі, праз якія тайком узіраюцца на цябе палітычныя вязьні. Прыслухаўшыся, пачуеш родную беларускую мову і ўраз пазнаеш, што гэта інтэлігенцыя і работнікі—сяляне, вышаўшыя з сярмяжнага народу. Твары іх бледныя, худыя, але поўныя рашучасьці, адвагі і надзеі на тое, што хутка „загляне сонца і ў нашае ваконца"...

Тутака даведаецеся аб розных страшных рэчах пры „бадяньні" і падчас арышту. Навет мяйсцовай лекарскай камісіі прыходзілася сцьвярджаць сьляды біцьця ў палітычных вязьняў пры дапросе паліцыяй. Так у палітычнага вязьня Гнідко Яна сцьвердзіла камісія знакі біцьця на целе і неабходнасьць зрабіць апэрацыю ў носе, бо пры дапросе паліцыя ўліла яму некалькі бутэлек вады, ад чаго зрабілася запаленьне. Акт гэты далучаны да справы.

Усе вязьні чуюць сябе хворымі.

Але-ж, ня ўзіраючыся на ўсё перанесенае, на надарванае здароўе,—настрой сярод гораdзенскіх палітычных вязьняў—бодры. У дзень 1 мая 1926 г. ўсе яны прычапілі чырвоныя банты і на прагулку ішлі радамі ды пялі інтарнацыянал. Начальнік вастрогу, зьявіўшыся ў гэны час, прабаваў забараніць пяяць, але атрымаў кароткі адказ: „сёньня сьвята рабочых усяго сьвету, і мы павінны да яго далучыцца!". Начальнік змушаны быў уступіць.

Зусім ня тое бачыма ў дзень 3 мая. У гэны дзень вастрожная адміністрацыя наладзіла тэатр у гмаху адзіночных камэр (budynek celkowy), дзе выступалі артысты мястовага тэатру, а таксама, прамоўца, які гаварыў, што канстытуцыя ў Польшчы ёсьць найдэмакратычнейшая з усіх істнуючых на сьвеце.

Палітычныя ўсе, як адзін, адмовіліся прыйсьці і ня прынялі ўчасьця ў сьвяткаваньні.

Прамоўца гаварыў аб роўнасьці і братэрстве. Казаць аб гэтым у мурох вастрогу — гэта зьдзек.

× **Зьдзек над сямьёю беларускага грамадзкага дзеяча.** У зьвязку з днём 1 мая 30/IV—1926 г. арыштаваны грамадзкі дзеяч і кандыдат у Сойм Бел. Сял.-Раб. Грамады Мікалай Якімовіч.

2 мая брат яго Віктар Якімовіч, 17 гадоў, пайшоў да сьледчага ўраду даведацца аб ім, але заместа таго, каб адказаць яму, вывядоўца схапіў яго за валасы і пасадзіў у халодную камэру.

Матка іх, 70 лет, бачучы, што няма доўга ўжо і другога сына, пашла сама пытаці і мусіла вярнуцца да хаты, нічога не даведаўшыся.

3 мая яна ўзноў зьявілася да сьледчага ўраду. Тут нехта ёй сказаў, што Віктара арыштавалі і пасадзілі ў камэру, а Мікалая 2 мая перавялі ў вастрог. Матка прынесла пальто і ежу для сына Віктара, але-ж вывядоўца ня прыняў, паліцыянт № 1472 заявіў, што вашага сына Віктара няма тутака. Матка далей стаяла на сваім і дамагалася, каб прынялі ежу.

Пачуўшы голас маткі, Віктар Якімовіч крыкнуў праз вакно „мама, я тутака і галодны"! Бедная старушка яшчэ больш пачала прасіць, каб прынялі пальто і ежу.

Тады паліцыянт № 1472 пачаў лаяць яе самымі вулічнымі славамі і ўдэрыў яе. Старушка—маці аблілася сьлязамі. Затым пайшоў у камэру да Віктара Якімовіча, скаваў яму рукі ды ногі і пачаў яго біць і валачыць па падлозе. Ад болю Віктар Якімовіч стаў крычаць. Пачуўшы гэта, матка пачала таксама крычаць: „людцы ратуйце, забіваюць майго сына!" Сабралося шмат людзей.

Матка пашла да старосты, але-ж яго не застала, бо было сьвята 3 мая. Тады яна зьявілася да старосты 4 мая і расказала аб выпадку. Староста загадаў прыняць ежу і пальто і расьследаваць справу. Але-ж гэта засталося толькі на славах...

Пратрымалі Віктара Якімовіча 5 дзён, зрабілі яму справу з арт. 102, абвінавачываючы ў камунізьме, пабілі і звольнілі з крымінальнай паліцыі.

Нёман.

Спэкуляцыя на беларускасьці.

Вядомы наймiт польскае эндэцыі самазванны „доктар" Павлюкевіч з дазволу і багаслаўленьня польскае ўлады езьдзіў па Наваградчыне рабіць мітынгі і прымаць на іх рэзалюцыі аб тым, нібыто беларускае насяленьне трэбуе ад сваіх паслоў і сэнатараў, каб галасавалі ў Польскім Нацыянальным Сабраньні за кандыдатуру Маршалка Пілсудскага ў Прэзыдэнты Рэспублікі.

Як сустрэлі „гастролі" Павлюкевіча сьвядомыя беларускія элемэнты, аб тым ужо нехта напісаў у адным з папярэдніх нумароў. Цяпер хочацца мне зьвярнуць увагу на другое.

Кожны з нас памятае, ак некалькі гадоў назад розныя „рады людовыя" і „стражы крэсовыя" рабілі нешта досіць падобнае тады, калі йшла справа аб замацаваньні за Польшчай Заходняе Беларусі. Памятаем, як тады баламуцілі нашае сялянства розныя польскія „людовцы", выносячы на мітынгах рэзалюцыі або зьбіраючы подпісы нашых сялян пад пэтыцыямі аб прылучэньні тае ці іншае мясцовасьці да Польшчы.

Цяпер час крыху іншы. Навет такія „левыя" польскія партыі, як „Вызволене" ды П П С (польскія сацыялістыя) ня маюць ужо тае да сябе веры ў беларускіх працоўных масах.

I вось — польскі нацыяналізм знайшоў сабе „доктара" Павлюкевіча, які стараецца праводзіць польскую нацыяналістычную задачу пад маркай беларуса.

Нічога дзіўнага няма ў тым, што чалавек, які яшчэ ўчора рад быў „за приличное вознаграждение" выпаўняць загады чыста буржуазных, гэтак скандальна скінутых польскіх урадаў, сягоньня зьмяняе скурку, пасылае віншавальную тэлеграму пану Пілсудскаму, перакідаецца ў гэтак званыя „пілсудчыкі" і стараецца (пэўна-ж не задарма!) муціць беларускае сялянства, каб яно сваімі рэзалюцыямі націскала на сваіх-жа законных прадстаўнікоў, выбраных усім беларускім насяленьнем, галасаваць у Нацыянальным Сабраньні так, як п. Павлюкевіч і яго закашчыкі лічаць патрэбным.

Павлюкевічаўскія рэзалюцыі, як акцыя „казённага" польскага агітатара, нікому з беларусаў непатрэбны. Патрэбны яны можа ўсялякім вызваленцам і пэпэсам, усяму леваму кірунку польскага нацыяналізму. Дык і ніводная з беларускіх пасольскіх групаў у Сойме і Сэнаце ніякае ўвагі на іх не зьвярнула, а беларускія паслы і сэнатары за мар. Пілсудскага ў Нацыян. Зборы не галасавалі.

Калі паслом нашым трэба ведаць апошнія думкі й жаданьні свайго сярмяжнага народу, дык яны самі ведаюць, што ім рабіць: ладзяць свае справаздаўчыя мітынгі і беспасрэдна ад насяленьня, іх выбраўшага, даведваюцца аб нашых, як нацыянальных, так і сацыяльных балячках. Дзіўна неяк, што Павлюкевіч—адзін адзіны „беларус" на ўсе Крэсы — мае прывілей склікаць мітынгі, ня будучы ані паслом ані сэнатарам.

Але, добра разглядзеўшыся, вялікага дзіва тут няма: плаціў калісь Павлюкевічу Барыс Савінков, дык Павлюкевіч арганізоўваў з Савінковым у тэй-жа самай Наваградчыне „Крестьянский Союз", заклікаючы беларусаў да адбудаваньня „третьей Росии". Гэткая „праца" Павлюкевіча крыху не згаджалася з польскаю паньствовасьцю" і спрытны „доктар" быў навет прыарыштованы... польскімі ўладамі. Цяпер Павлюкевіч мае іншых працадаўцаў і дзеля гэтага робіць іншае.

Хто сачыў за яго адкрытымі выступленьнямі, за яго пісанінай у сваёй рэптыльнай газэтцы, той добра разумее, які з Павлюкевіча „беларускі" дзеяч. Напрыклад, калі даведаўся Павлюкевіч, што беларусы мелі няўдачу на выбарах у Латвіі, дык адразу ўцешыўся на шпальтах свайго нябожчыка „Грам. Голасу". Калі пачуе ён, што беларусам не ўдаецца шырока арганізавацца ў Амэрыцы, ды цешыцца таксама. Бяльмом на вачох Павлюкевіча зьяўляюцца навет праўдзівыя кузьні беларускае культуры; усе памятаем, што выпісваў ён у сваёй газэціне пра Віленскую Беларускую Гімназію, пра яе вучняў, з якіх дзе-хто быў навет катаваны дэфэнзываю, аб чым сьведчаць інтэрпэляцыі нашых паслоў да польскіх міністраў.

Дзеля чаго ўсё гэта робіцца, лёгка зразумець: проста, кажучы парасейску, „гони монету!" —Але сябраваньне польскіх лева-нацыяналістычных партыяў з п. Павлюкевічам, дапусканьне яго на свае вечы, як гэта было на ладжаных у Вільні на карысьць п. Пілсудскага пэпэсаўскіх вечах, — ня робіць чэсьці польскай дэмакратыі. Навет больш: яно сьведчыць, што польскія „левыя" нацыяналісты, калі-б і мелі сілу, дык далі-б беларусам акурат тое самае, што давалі папярэднія ўрады,—іменна: „асабістыя канцэсіі" (прасьцей: юдавы срыбнікі...) розным Павлюкевічам і — **ніякіх уступак Беларускаму Народу!**

М.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Карэспандэнцыі.

Прысылаючы карэспандэнцыю — не забывайцеся падаваць свой адрас і прозьвішча — для ведама рэдакцыі.

Рэдакцыя ня можа памясьціць карэспандэнцыі, ня ведаючы, ад каго яна.

Мы ужо мелі выпадкі, што ворагі нашы прысылалі выдуманыя і непадпісаныя карэспандэнцыі з мэтай падвясьці газэту. Рэдакцыя.

Водгукі галадоўкі ў Навагрудзкай турме.

Урадовае паведамленьне аб галадоўцы ў Навагрудзкай турме ўсю адказнасьць валіць на арыштантаў, якія быццам пад кіраўніцтвам камуністаў стараліся выкарыстаць пераварот і завясьці ў вастрозе новыя парадкі.

Запраўды-ж прычына галадоўкі саўсім не палітычныя зьмены.

Як-бы ні тлумачылася адміністрацыя вастрогу,—яна вінавата ў галадоўцы; вінаваты тыя парадкі, царпець каторыя вязьні ня мелі больш сілы.

Пасол Сабалеўскі з соймавай трыбуны знаёміў грамадзянства з Навагрудзкім вастрогам, але ён далёка не сказаў усяго.

Вось хоць бы карцэр. Праводзіроў галадоўкі пасадзілі ў карцэр. Здавалася-б, нічога страшнага, усё роўна—ці камэра, ці карцэр.

У нас-жа пануе звычай, што арыштанта, каторага караюць такім спосабам, разьдзяваюць перад тым да-гала і кідаюць на цэмэнт для „podjęcia powagi instytucji". Пасол Сабалеўскі забыўся мусіць, што сам ён быў сьведкам гэтага.

Далей праваканцыя. Паслу ведама, як правакатар Окурodzкі, з каторым няньчыцца адміністрацыя турмы, вёў падкоп, а кару панясьлі за гэта саўсім нявінныя людзі...

Або вось справа апошняй галадоўкі. Адміністрацыя загатаўляе звычайна вялікі запас бульбы. Бульбу гэтую абкладываюць саломай. Да вясны, ясна, салома збутвеець, згніець, сьмярдзіць. Яе цяпер высушылі і хацелі набіць сяньнікі, гэта і было падставай галадоўкі. Няхай бы тыя, каму здаецца справа сяньніка мала важнай справай, папрабавалі спаць на гнільлю! Яны-бы тады сказалі, ці за гэта трэба дзякаваць, ці крычэць на ўвесь сьвет, просячы ратунку ад павольнага атручваньня!

Чакаем ад пасла Сабалеўскага, які знаёмы з палажэньнем у Навагрудзкай турме, што ён возьмецць на сябе абавязак дабіцца ад улады зьмены парадкаў, пануючых тутка. **Асташынец.**

Новыя „дабрадзеі".

(Баранавіцкі пав.).

Ад веку чмуцяць мужыку галаву паны, папы ды іхныя верныя людзі,—дзякі, пісары і іншыя.

Цяпер у нас знайшліся новыя „дабрадзеі"—польская партыя сацыялістаў (ППС), якія выдаюць газэту „Красное Знамя".

Чым, здавалася-б, благая партыя? Праграма—чытай ды цешся.

Вось-жа ў вёсцы Грабоўцы запісаліся людзі ў пэпэесы. Хоць сяляне цяперака і асьцярожныя,—пацягнуў за сабой грам. Шукала, зволнены нядаўна з пасады машыніста на вузкакалейцы. Сам чалавек — ну дык і пайшлі за ім.

Праўда, для тутэйшай адміністрацыі навет пэпэесы страшныя. Шукала ўжо сядзіць у арышце. Засудзілі яго на 2 тыдні. У нас аднак гэта нічога: сядзець тутка і на некалькі гадоў. Ды ня ў тым справа.

Шукала скора зрабіўся заступнікам старшыні паветавага камітэту пэпэсаў—Махая. Мы пазнаёміліся тады бліжэй з Махаем і шмат чаго даведаліся. Махай — гэта старшыня польскіх легіяністаў, ужо атрымаўшых у павеце асады з пад носу нашага сялянства. Быў ён жандармам, пасьля служыў у PKU у Баранавічах, мае трох братоў, з якіх адзін ужо атрымаў асаду каля вёскі Пастаркі, Сталавіцкай гм., два другія маюць крамку ў тэй-жа вёсцы ды лічацца кандыдатамі на асаднікаў, а сам Махай не адмовіўся ад асады каля Ліды. Спачатку не хацелася верыць, што гэтакі ён „сацыяліст". Пераканаліся пасьля, што праўда,—праўда ясная, як сонца.

Вось дык езуіты, вось і слухай іх! Гавораць адно, а робяць другое.

Шукайце, сяляне, сваей арганізацыі, ня лезьце да пэпэесаў. Няхай жыве Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада. **Нехта з вясковых.**

Нашае начальства і зладзействы.

(Столбцы).

Нашыя Столбцы з бруднага мястэчка перамяніліся цяпер у паветовае места.

У зьвязку з гэтым панаязджалі сюды з ўсіх канцаў Польшчы хмары чыноўнікаў, паліцыянтаў, сышчыкаў, дык у дзень кірмашу цяжка з імі на рынку разьмінуцца. У Стоўпцах яны паразъязджаліся, панадзявалі „лякеры" ды з пагардай глядзяць на беларускае „быдла"—гэта значыць на мяйсцовых сялян і работнікаў.

Дзеля большай выгоды гэтых панкаў казна пабудавала штук 15 дамоў, гдзе яны і жывуць прыпяваючы. Быў праект навет будаваць яшчэ новыя, але міністар фінансаў агледзіўся нарэшце, што грошаў няма, дык будова прыпынілася.

Адным словам, жыцьцё чыноўніка пастаўлена—нягледзячы на агульнае цяжкое палажэньне—у вельмі добрыя варункі.

Хаця павет наш мае быць злучаны з суседнім, што даўно ўжо з мэтай эканоміі трэба было зрабіць,—чыноўкі хочуць, відаць, загаспадараваца на ўсе жыцьцё за народныя грошы. Так „Starosta" купіў сабе аўтамабіль за 7.000 зл., а 7.000 выходзіць у яго паводлуг сьметы на абслугу, бэнзыну і г. д. Школьны інспэктар мае таксама свой асобны параконны выезд, камэндант паліцыі — таксама.

Усе людзі гэтыя забыліся хадзіць пехатой, а плаціць мусіць працуючы народ.

Але чыноўнікі яшчэ незадаволены: знайшліся між імі такія, якія наважыліся проста абакрасьці казначэйства.

З касы ўзяў нехта па фальшывай асыгнацэ 65,000 злотых. Аказалася, што зладзеем быў сам-жа казначэй Блоньскі.

Яго, жонку і чыноўніка Яворна арыштавалі ды пасадзілі ў Навагрудзкай турме. **Лесавік.**

Куды дзяюцца народныя грошы.

(Стаўпецкі пав.).

У маі месяцы с. г. на Засульскую гм., Стаўпецкага пав. было асыгнавана каля $5^1/_2$ тысяч злотых.

Грошы гэтыя мелі быць выданы мяйсцоваму насяленьню, як помач пры засевах. Ня нам прыйшлося карыстацца імі, хаця падаткі бяруць з нас акуратна. Староста разьдзяліў грошы прыблізна гэтак: 5.000 зл. дасталася мяйсцовым абшарнікам — чатыром братом Крупскім, рэшта-ж—некальким сялянам з гміны. Рука руку мые! Крупскія маюць шырскія сувязі (сам быўшы міністар, а цяперашні ваявода — Рачкевіч прыяжджае да іх у госьці). Ня дрэнна жывецца і розным панскім слугам. Войт Засульскай гміны, лякай Крупскіх, вялікі патрыёт Жолнеркевіч не забываецца аб сваей кішані. За час свайго ўрадаваньня ён нейкім чынам умудрыўся купіць сабе ў Ракавіцкай гміне цэлы фальварак. Адна польская газэта так яго і называе „złodziej Zasulskiej gminy".

Па вёсках тымчасам езьдзяць экзэкутары і бяруць ад мужыкоў кажухі ды падушкі **Засульсці.**

Самаўрады.

(Слонімшчына)

У Чамярох (Слонімшчына) яшчэ ад 1919 годзе вёўся звычай мяняць што-год грамадзкага солтыса. Папярэднія солтысы, мяйсцовыя людзі, прыймалі абавязак, калі грамада ім яго давала, але ахвотна і ўступалі згодна з воляй сваіх выбаршчыкаў. Аднак, мусіць, няма ніводнага стада без паршывае гавечкі. Становіцца солтыса ў 1924 годзе грамада Чамерская дарučыла свайму гр. Аляксандру Дземяшэвічу. Спачатку ён быў солтыс нішто, пакуль не расьпіўся. Прыйшоў час новых выбараў. Адбыліся яны ў лістападзе 1925 году, і грамада аднагалосна выбрала солтысам Антона Хвясеню. Зрабілі пратакол, падпісаліся, адаслалі і чакаюць. Праз неякіх месяцаў два пайшлі чуткі, што Слонімскі паветовы староста пан Пшэцішэўскі чамусьці не зацьвердзіў выбараў і даручыў войту гміны В. Корчыцу зрабіць перавыбары. Прыехаў войт. Грамада сабралася, як адзін, у хаце солтыса Д. Солтыс быў п'яны, як дым. Ня мог языком валадаць. Калі гаварыў штось, дык ня можна было разабраць яго гутаркі. Грамада зноў аднагалосна выбрала свайго новага кандыдата Антона Хвясеню. Новага солтыса аднак ізноў не зацьвердзілі, а старому далі неграніченыя паўнамоцтвы. Дземяшэвіч ад сябе назначыў сабе заступнікам Максіма Міску, і работа пайшла. Пасьля новай прысягі стары солтыс пачаў піць пановаму. А, п'ючы, каб не падгадзіць і апраўдаць даверие начальства, пачаў душыць людзей і падаткамі, фурманкамі, і дорогамі. Стогнам стогнуць людзі ад гвалтаў, а зьмяніць стаўленіка ўсемагутнага старосты ня могуць. Mo' хіба нашы паслы што зробяць?

Вось якія ў нас самаўрады! 90 падпісаў ад 700 душ жыхараў нічога ня варты. Староста скідае, староста і назначае. Пікнуць нíхто ня сьмее!

Неяк каля 25-га красавіка сёл. году налецела на вёску Чамяры, Слонімскага пав., гміннае начальства: войт Чамерскай гміны Вандалін Корчыц, паліцыянт гміннага пастарунку п. Сініцкі, памочнік гміннага сэкрэтара, ды сам пан солтыс Чамерскай грамады Аляксандар Дземяшэвіч. Прыехаўшы на вёску, яны загадалі, каб зараз-жа ў адзін дзень усе жыхары вёскі заплацілі розныя зацягнуўшыеся падаткі за мінулыя гады. Сьмешна падумаць! Дзе возьме селянін грошай на падаткі за дзень, калі ён ня мог іх заплаціць за некалькі гадоў!

Але „начальства" пачало па-свойму. Яно проста брала ў гаспадароў усё, што пападалася пад руку.

Пры гэтым нумары ўсім нашым падпісчыкам рассылаецца кніжачка: „Праграма і арганізацыйны статут Беларускае Сялянска Работніцкае Грамады".

Гэтак у беднага жыхара вёскі Чамяры Мікалая Багданчука забралі ўсё яго збожжа: жыта каля 20 пудоў, грэчкі каля 5 пудоў, падоўжную пілу і папярэчную пілу і сякеры. Жыта і грэчку дзеткі Багданчука зарабілі, пасучы быдла сваіх суседзяў, а падоўжною пілу яны пазычылі ў Дзеравянчычах, каб напілаваць дашок хоць на вокны ў хаце. І вось гэнае запрацованае цяжкай працай пастуха — забрана за падаткі. Бачучы пагражаючы сям'і голад, Багданчук уперш прасіў, каб яго калеку ня нішчылі, каб не забіралі ў яго дзетак апошняга куска; аднак дарма! І збожжа і рэчы цяпер у гміне, а сьляпога пакрыўджанага Багданчука цягаюць цяпер яшчэ за „абразу ўлады". Ужо ад пракурора ёсьць паперка, што Багданчука будзець судзіць Акружны Суд і прапануюць яму паставіць сьведкаў ад сябе і наняць адвоката. Але беднаму сьведкаў проста няма за што. Ён пачарнеў ад голаду, апусьціў рукі і без надзеі жджэ, каб хоць хутчэй крапіўка вырасла, а на розныя папяровыя „всказыкі" і тэрміны не зьвяртаець увагі. Хай будзе, што будзе! **Чупрыновіч.**

Дзе права.

(Гарадок, Маладэчанскага пав.).

Пан Халкоўскі, прадаючы маёнтак Чэрнева, разам прадае і вясковыя сэрвітуты, — напр., вёскі Дарохаў. Купіў сэрвітут гэтай вёскі нейкі Якуб Казялок. Калі прыйшоў ён араць, сяляне ўзбурыліся ды і не пазволілі яму; кажучы гэта нашае, дзе мы будзем скаціну пасьвіць!..

26-га траўня ў в. Дарохі прыехалі ўзброеныя паліцыянты. Зьехаліся яны з двох пастарункаў—з Гарадоцкага і Карабліянскага. Главар паліцыі — камандант прыказаў сабраўца ўсім сялянам у двор п. Куровскага, куды і паехала паліцыя. Там камандант назваў сялян бандытамі, паўстанцамі, бальшавікамі і г. п., а пасьля сказаў, што п. Казялок будзе араць, а сяляне ня маюць сэрвітуту. Казаў, што гэтак распарадзіўся п. Староста. Хто-ж не паслухае, то адправіць у вастрог у Вялейку.

Сяляне не паслухалі, яны цьвёрда стаялі на тым, што як-бы ня было,—свайго не дадуць, бо няма дзе пасьвіць скаціну. На другі дзень паклікалі сялян у м-ка Чэрнева, дзе быў войт Гарадоцкай гм., 6 чалавек паліцыі і адзін у цывільнай вопратцы, якога вялічалі п. заступнікам—старосты.

Разьясьнялі яны, што мы ня маем права пасьвіць. Сяляне не згадзіліся, — тады заступнік старосты сказаў, што будзе йначай.

На трэці дзень пасьля першай зьявы прыехаў Казялок араць, а з ім 10 чал. коннай паліцыі і 2 пеших. Бабы і падросткі пашлі бараніць сваё дабро, якое спрадвеку іх было. Тут і накінулася на іх паліцыя,—пачалі паліцыянты таптаць конямі кабет і дзяцей. Узьняўся енк і лямант. Людзі былі зьбіты шаблямі паліцыі і патоптаны канямі.

Апрача таго арыштавалі 6 чалавек: П. Лупіна, А. Ахрэма, М. Дароха, А. Атуха, А. Абрамчыка і К. Кахановіча—14-гадовага хлапца, які быў бяз вопраткі і шапкі, — матка панясла яму вопратку, дык і матку арыштавалі. Пратрымаўшы іх пору (суткі) ў Гарадку, пагналі ў Маладэчна. Што будзе, няведама. Моцна пазьбівалі арыштаваных.

Вось як з намі! 70-х гадовыя дзяды і з нашай і з суседніх вёсак могуць пасьведчыць, што спрадвеку мы пасьвілі.

Паважаныя браты, паслы з Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады—заступіцеся! **Сяляне.**

Ад Рэдакцыі. Соймавы Клюб Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады ўжо заняўся гэтай справай, і ў № 14 нашае газэты была зьмешчана тэлеграма, пасланая ў гэтай справе паслом Ракам-Міхайлоўскім міністру ўнутраных спраў. Думаем, што паслы на гэтым не затрымаюцца, а давядуць справу да належнага канца.

„Беларуская Справа", адзіная ў Заходняй Беларусі беларуская газэта, якая стаіць у абароне інтарэсаў працоўнага сялянства і рабочых.

Кожны сьвядомы беларус павінен чытаць, распаўсюджываць, выпісываць і дапамагаць сваей газэце.

Цэнтральным Сэкрэтарыятам Беларускай Сялянска - Работніцкае Грамады выдадзена кніжка—**Праграма і Арганізацыйны Статут Грамады.**

На гэтых днях выйдзе з друку другая кніжка — **Інструкцыя аб тым, як тварыць арганізацыі Белар. Сялянска - Работніцкае Грамады на мяйсцох.** У Інструкцыі, апрача падробнага выясьненьня парадку тварэньня Гурткоў Грамады, зьмешчаны і выпіскі з істнуючых законаў і распараджэньняў аб сходах, сабраньнях публічных і прыватных, аб мітынгах і аб магчымасьці працы такіх легальных палітычных партый, як нашая Грамада.

Кніжкі гэтыя, па цане кожная 20 грош., можна набываць у Цэнтральным Сэкрэтарыяце. Там-жа можна дастаць і кніжку — **Прамовы паслоў Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады ў Польскім Сойме.**

Цэнтральны Сэкрэтарыят
Wilno, ul. Wileńska № 12, m. 7.

Адказны-Рэдактар: **Ал. Вільчыцкі.** Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22. Выдавец пасол на Сойм **П. Мятла.**